цэласную карціну гістарычнага развіцця Беларусі ў гэты перыяд, усвядоміць яго як асобны этап у дзяржаўным развіцці краіны і ліквідаваць той прабел, які доўгі час існаваў у беларускай гісторыі.

[1] Гл.: Довнар-Запольский М. Очерки истории Кривической и Дреговической земель до конца XII столетия. Киев, 1891. С. V.
[2] Гл.: Голубовский П.В. История Смоленской земли до начала XV столетия. Киев, 1895. С. I.
[3] Гл.: Довнар-Запольский М. Указ. тв. С. VI.
[4] Гл.: История БССР: В 2 ч. Мн., 1981. Ч. 1. С. 52.
[5] Гл.: Рыбаков Б.А. Киевская Русь и русские княжества. М., 1982. С. 470.
[6] Гл.: Ермаловіч М.І. Па слядах аднаго міфа. Мн., 1989. С. 10.

***Віданава Ірына Аляксееўна*** – аспірантка кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык названай кафедры П.А. Лойка.

*Л.В. МІКАЛАЕВА*

## ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ПАЧАТКУ XVI ст.

Знешняя палітыка Вялікага княства Літоўскага пачатку XVI ст. была прадвызначана агульнай міжнароднай сітуацыяй ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне, што абумовіла змест яе асноўных накірункаў. Геапалітычнае становішча дзяржавы дамінавала ў гэты перыяд у выбары партнёраў і развіцці ўзаемаадносін з яе праціўнікамі. У цэлым знешнепалітычнае становішча Вялікага княства Літоўскага ў пачатку XVI ст. можна характарызаваць як складанае і нават трагічнае. К канцу XV ст. Княства ўжо не мела ваенна-палітычнага патэнцыялу, неабходнага для ўтрымання ўсёй сваёй велізарнай дзяржаўнай тэрыторыі. Яшчэ раней, у часы кіравання вялікага князя Казіміра Ягайлавіча (1440–1492), ВКЛ адмовілася ад наступальнай агульнарускай праграмы, хаця былі і зручныя сітуацыі, якія дазвалялі і надалей пашыраць тэрыторыю. Гэты перыяд супаў па часе з поспехамі палітыкі Масквы і яе ўзмацненнем. З геапалітычнага пункту гледжання ваенна-палітычная ініцыятыва ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне да пачатку XVI ст. перайшла ад Вялікага княства Літоўскага да Маскоўскай дзяржавы, межы якой сутыкаліся з беларуска-літоўскімі. Супрацьстаянне дзвюх найбуйнейшых дзяржаў Усходняй Еўропы, асноўнай праблемай у дачыненнях якіх яшчэ з XIV ст. з'яўлялася так званая "спадчына Рурыкавічаў" – землі, населеныя пераважна праваслаўным насельніцтвам, якія ў IX–XII ст. уваходзілі ў сістэму княстваў Русі, немінуча вылілася ў адкрытыя ваенныя дзеянні. Прычым маскоўскі вялікі князь Іван III падрыхтаваўся да іх пачатку значна лепш, стварыўшы антыягелонскую кааліцыю, у якую, акрамя Масквы, увайшлі яшчэ Крымскае ханства і Малдаўскае княства. Сам факт стварэння азначанай кааліцыі, на наш погляд, можна ацэньваць як прыватны выпадак дзеяння сістэмы палітычнай раўнавагі, што пачала наладжвацца ў агульнаеўрапейскім маштабе і рабіла немагчымым існаванне дзяржавы-гегемона ў пэўным рэгіёне.

У выніку распачатай па ініцыятыве Масквы вайны 1492–1494 гг. ВКЛ панесла першыя тэрытарыяльныя страты. Мірная дамова ад 5 лютага 1494 г. зафіксавала новую мяжу паміж дзяржавамі[1]. Мір быў замацаваны шлюбам вялікага князя літоўскага Аляксандра з дачкой Івана III Аленай. Але дынастычны шлюб не вырашыў усіх супярэчнасцей і нават, як паказалі далейшыя падзеі, выкарыстоўваўся Іванам III для інсціравання новых зачэпак для вайны з ВКЛ. Да таго ж яшчэ падчас вайны 1492–1494 гг. маскоўскі гаспадар пачаў выкарыстоўваць тытул "государь всея Руси"[2], які заключаў у сабе адкрытую прэтэнзію на населеныя славянскім і пераважна праваслаўным насельніцтвам землі ВКЛ ("рускія" землі па тагачаснай тэрміналогіі), тым



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

самым вызначаючы палітычную праграму, якую Іван III пачаў рэалізоўваць ужо праз шэсць гадоў пасля заключэння мірнай дамовы з вялікім князем лгтоўскім Аляксандрам. У XVI ст. абедзве дзяржавы ўвайшлі ў стане вайны паміж сабою.

Склаўшаяся сітуацыя адбілася на асаблівасцях знешняй палітыкі Вялікага княства Літоўскага азначанага перыяду, у якой можна выдзеліць тры асноўныя і цесна ўзаемазвязаныя накірункі: **усходні**, дзе разгортваўся канфлікт з Маскоўскай дзяржавай; **паўднёвы**, дзе ВКЛ у саюзе з Вялікай Ардой (да яе разгрому ў 1502 г.)[3] дзейнічала супраць Крымскага ханства і Малдаўскага княства; **заходні** і цесна звязаны з ім паўночна-заходні накірункі, дзе асноўнымі знешнепалітычнымі партнёрамі былі Польшча, Венгрыя, Чэхія, Лівонскі ордэн і Швецыя.

З канца XV ст. прыярытэтным у знешняй палітыцы ВКЛ стаў менавіта ўсходні накірунак, на якім і разгортваліся важнейшыя падзеі. Асноўны змест літоўска-маскоўскіх адносін склалі як адкрытыя ваенныя дзеянні на памежжы і ўсходніх землях ВКЛ, так і шэраг дыпламатычных акцый і крокаў. Асноўнай мэтай дзейнасці дыпламатыі Вялікага княства ў гэтым накірунку была нейтралізацыя Маскоўскай дзяржавы і дасягненне status quo. На жаль, мэта гэта дасягнута не была. Вайна 1500–1503 гг., фармальнай зачэпкай для якой з'явіліся раздутыя маскоўскай прапагандай пытанні аб быццам бы маючых месца праследаваннях праваслаўнага насельніцтва Вялікага княства Літоўскага і аб новым тытуле маскоўскага вялікага князя – “государь всея Руси”, які не прызнаваўся вялікім князем літоўскім Аляксандрам, бо той справядліва бачыў у ім непрыхаваны замах на дзяржаўную ўласнасць сваёй краіны, стала па сутнасці ваеннай катастрофай ВКЛ, якая прывяла да страты трэцяй часткі тэрыторыі дзяржавы[4] і рэзка змяніла суадносіны сіл у рэгіёне на карысць Масквы. Склаўшаяся сітуацыя непазбежна набліжала новую вайну з Маскоўскай дзяржавай.

Новая ваенная кампанія была пачата пераемнікам Івана III Васілём III у 1507 г., калі яшчэ не выйшаў тэрмін шасцігадовага перамір’я, заключанага ў 1503 г. Ёй папярэднічала напружаная дыпламатычная падрыхтоўка, калі новы вялікі князь літоўскі і кароль польскі Жыгімонт Казіміравіч спрабаваў аб’яднаць для барацьбы з Маскоўскай дзяржавай сілы ВКЛ, Польшчы, Лівоніі, Крымскага і Казанскага ханстваў і наладзіў зносіны з братам вялікага маскоўскага князя Юрыем Іванавічам, спрабуючы дэстабілізаваць унутрыпалітычнае становішча ў Маскоўскай дзяржаве шляхам падрыхтоўкі змовы з мэтай адхілення Васіля III ад улады. У выніку рэальная дапамога была атрымана толькі ад Польшчы. Вайна 1507–1508 гг., цесна звязаная на апошнім этапе з мяцяжом князя Міхаіла Глінскага, нікому не прынесла поспеху і скончылася так званым “вечным мірам”, заключаным 8 кастрычніка 1508 г., згодна з якім ВКЛ вярнула толькі Любеч[5]. У астатнім “вечны мір” замацоўваў межы, што склаліся паміж Вялікім княствам Літоўскім і Масковіяй у выніку папярэдніх войнаў. Як паказалі далейшыя падзеі, для абодвух бакоў гэта была толькі часовая перадышка.

На паўднёвым накірунку Княству з пачатку XVI ст. даводзілася дзейнічаць супраць Крымскага ханства, якое ўваходзіла на той час у створаную пад эгідай Масквы антыягелонскую кааліцыю. Адзіным рэальным саюзнікам тут была Вялікая Арда хана Шыг-Ахмата, вельмі аслабелая на той перыяд, хаця да 1502 г. дзейнічаў і саюз з Малдаўскім княствам. Але апошняе, з'яўляючыся васалам Асманскай імперыі[6], не магло аказаць дапамогу ў барацьбе супраць крымчакоў, ханы якіх таксама былі васаламі турэцкага султана. Спробы ВКЛ нейтралізаваць Крымскае ханства з дапамогай дыпламатычных сродкаў да сярэдзіны першага дзесяцігоддзя XVI ст. заставаліся беспаспяховымі, але пасля разгрому крымчакоў пад Клецкам 6 жніўня 1506 г.[7] і пад уздзеяннем новай расстаноўкі сіл ва Усходняй Еўропе Крым



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

змяніў свой знешнепалітычны курс і ў тым жа 1506 г. хан Менглі-Гірэй прыслаў у Княства пасольства з прапановай заключыць крымска-літоўскі саюз супраць Масквы. З крымскімі ласламі прыехаў і пасол ад казанскага хана Махмет-Эміна, бо Казань таксама павінна была ўвайсці ў азначаны саюз[8]. Крымска-літоўскі саюз быў заключаны ў 1507 г.,[9] але, нягледзячы на шматразовыя абяцанні, Менглі-Гірэй так і не паслаў свайго войска для ўдзелу ў ваеннай кампаніі 1507–1508 гг. на баку ВКЛ. Ад заключэння гэтага саюзу ВКЛ не атрымала карысці, бо і тая маральная падтрымка, якую быццам бы аказваў вялікаму князю Жыгімонту хан Менглі-Гірэй не была гарантам спынення крымскіх набегаў. Чарговы з іх адбыўся ўжо ў 1508 г.[10], нягледзячы на тое, што з Княства ў Крым рэгулярна напраўляліся ўпамінкі. Сяброўства з крымскім ханам каштавала вялікіх выдаткаў. Так што вынік знешнепалітычных акцый на гэтым накірунку на канец першага дзесяцігоддзя XVI ст. нельга назваць цалкам паспяховым, бо вынікі крымска-літоўскага саюзу пайшлі ў асноўным на карысць ханства, а на адносінах з Малдаўскім княствам негатыўна адбілася яго канфрантацыя з Польшчай, злучанай з ВКЛ персанальнай уніяй, у выніку чаго іх інтарэсы былі цесна узаемазвязаны. Такім чынам, нягледзячы на тое, што асноўная мэта знешняй палітыкі ВКЛ на гэтым накірунку – нейтралізацыя Крымскага ханства – быццам бы была дасягнута, шэраг палітычных пралікаў змяншалі значэнне гэтага факта.

На заходнім і паўночна-заходнім накірунках у ВКЛ таксама былі і партнёры, і праціўнікі. Да ліку першых належалі дзяржавы Ягелонскай кааліцыі: перш за ўсё Польшча, а таксама Венгрыя і Чэхія, на дапамогу якіх у барацьбе з Масквой і створанай ёю кааліцыяй магло разлічваць ВКЛ. Наладжваліся адносіны са Швецыяй і нават прадпрынята спроба заключэння літоўска-шведскай уніі, скіраванай супраць Маскоўскай дзяржавы[11], але вынік гэты дасягнуты не быў. Падтрымліваліся зносіны з Рымскай курыяй, накіраваныя, у прыватнасці, на ажыццяўленне царкоўнай уніі[12], каб пазбавіць маскоўскіх вялікіх князёў магчымасці ўмешвацца ва ўнутраныя справы ВКЛ пад выглядам абароны праваслаўя. На першым этапе разглядаемага перыяду значным саюзнікам Княства быў і Лівонскі ордэн, які намінальна падпарадкоўваўся ўладзе папы рымскага і імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі германскай нацыі. Апошняя імкнулася аслабіць уплыў Ягелонаў у рэгіёне, прад'яўляла прэтэнзіі на Венгрыю і Чэхію, падтрымлівала незалежную палітыку Тэўтонскага ордэна, які імкнуўся выйсці з васальнай залежнасці ад Польшчы. Як патэнцыяльны саюзнік Масковіі імперыя была галоўным праціўнікам ВКЛ на заходнім накірунку. Таму нядзіўна, што ў 1500 г. браты Ягелоны ладпісалі саюз з Францыяй, які меў і антыгабсбургскую накіраванасць. Імператар Максіміліян Габсбург, у сваю чаргу, дабіўся таго, што Лівонскі ордэн у вайне 1507–1508 гг. ужо не ўдзельнічаў і не аказаў падтрымкі ВКЛ[13]. Як бачна са сказанага вышэй, асноўныя дыпламатычныя акцыі на Захадзе былі цесна звязаны з падзеямі, што адбываліся на ўсходнім накірунку і мелі мэтай стварэнне антымаскоўскіх саюзаў і недапушчэнне пашырэння антыягелонскай кааліцыі шляхам паслаблення патэнцыяльных саюзнікаў Масковіі. Але, на жаль, мэта гэта не была дасягнута, бо большасць заключаных тут саюзаў альбо не былі рэалізаваны, альбо не прынеслі станоўчых вынікаў. Асноўныя прычыны гэтых правалаў можна бачыць як у супрацьдзеянні іх рэалізацыі незацікаўленымі бакамі, так і ў непаслядоўнасці выканання ўмоў дамоўленасцей з боку ВКЛ і іншых дзяржаўудзельніц, бо, як правіла, гэтыя саюзы заключаліся ў сілу гістарычных традыцый і дынастычных сувязей з дзяржавамі, якія не мелі з ВКЛ агульных знешнепалітычных інтарэсаў.

Такім чынам, галоўнай мэтай знешняй палітыкі ВКЛ пачатку XVI ст. з'яўлялася забеспячэнне бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Рэалізацыі дадзенай мэты імкнуліся дасягнуць рознымі **сродкамі**, асноўнымі сярод якіх з'яўляліся наступныя:

• *палітычныя*: дыпламатыя. На практыцы прымяняліся наступныя метады яе рэалізацыі: пасольскія візіты, перамовы, падрыхтоўка і заключэнне ў асноўным двухбаковых пагадненняў, дыпламатычная перапіска і г. д.;

• *ідэалагічныя сродкі*: важнейшым сярод якіх з'яўляецца знешнепалітычная прапаганда;

• *ваенныя сродкі*: ваенныя сілы ВКЛ у дадзеным выпадку выкарыстоўваліся ў асноўным як сродак стрымлівання агрэсіўных памкненняў іншых дзяржаў.

Нягледзячы на тое, што знешняя палітыка ВКЛ была актыўнай на ўсіх асноўных накірунках, гэта мэта дасягнута не была: тэрытарыяльныя страты не ліквідаваны, быў нанесены значны удар па міжнародным прэстыжы Княства. Выправіць гэтыя пралікі трэба было як мага хутчэй. Але, як паказалі далейшыя падзеі, аднавіць былую веліч Вялікаму княству Літоўскаму ўжо не ўдасца.

[1] Гл.: Литовская метрика. Книга записей 5. Вильнюс, 1993. С. 134–136; Сборник Русского исторического общества (далей – Сб. РИО). СПб., 1882. Т. 35. С. 125–129.
[2] Гл.: Там жа. С. 64; Сб. РИО. Т. 35. С. 81.
[3] Гл.: Литовская метрика. Книга записей 5. С. 180–181; Сб. РИО. СПб., 1884. Т. 41. С. 417–422.
[4] Гл.: Сб. РИО. Указ. тв. Т. 35. С. 412–439.
[5] Гл.: Литовская метрика. Книга записей 8. Вильнюс, 1995. С. 125–128.
[6] Гл.: Historia dyplomacji Poiskej. Warszawa, 1982. S. 534.
[7] Гл.: Полное собрание русских летописей. М., 1975. Т. 32. С. 101, 172–173.
[8] Гл.: Литовская метрика. Книга записей 8. Указ. тв. С. 51, 56.
[9] Гл.: Там жа. С. 84–85.
[10] Гл.: Там жа. С. 129.
[11] Гл.: Там жа. С. 64.
[12] Гл.: Jablonowski H. Westrussland zwischen Wilna und Moskau. Leiden, 1955. S. 99.
[13] Гл.: Литовская метрика. Книга записей 8. Указ. тв. С. 120–121.

***Мікалаева Людміла Віктараўна*** – аспірантка кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, намеснік дэкана гістарычнага факультэта Ю.Л. Казакоў.

*А.Г. КАХАНОЎСКІ*

## САЦЫЯЛЬНАЯ СТРАТЫФІКАЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА 60–90-х гг. XIX ст.: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ

Рэтраспектыўны гістарычны аналіз сацыяльнай стратыфікацыі грамадства (дыферэнцыяцыя, іерархія пэўных груп людзей на аснове няроўнасці размеркавання ўлады, уласнасці і прэстыжу) – шматпланавая навуковая праблема, пастаноўка якой у айчыннай гістарыяграфіі актуальная ў апошнiя дзесяцігоддзе. Канкрэтныя формы сацыяльнай стратыфікацыі дастаткова шматлікія і розныя. Для беларускага грамадства 60–90-х гг. XIX ст. значным з'яўляецца вывучэнне саслоўнай, сацыяльна-прафесійнай, класавай, у пэўнай ступені культурна-нарматыўнай стратыфікацыйных сістэм, а таксама пытанняў сацыяльнай мабільнасці насельніцтва. Важнай навуковай задачай з'яўляецца таксама аналіз уплыву мадэрнізацыйных працэсаў на іерархію пэўных груп беларускага грамадства, вызначэнне сутнасці мадэрнізацыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст., яе агульных і спецыфічных рыс.

У 60–90-х гг. XIX ст. насельніцтва Беларусі ўяўляла складанае перапляценне элементаў, характэрных для сацыяльнай структуры індустрыяльнага грамадства, і элементаў саслоўнай іерархіі мінулай эпохі. На працэс буржуазнай эвалюцыі структуры насельніцтва Беларусі стагніруючае ўздзеянне аказвала ўрадавая палітыка, асабліва абмежавальныя законы ў дачыненні



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm